https://cyberleninka.ru/article/n/sovremennye-kommemorativnye-praktiki-obrazovatelnyy-i-vospitatelnyy-potentsial. – Дата доступа : 15.03.2021.

Бруевич В. А., студент 350 группы
Научный руководитель– Герасимёнок Д. В.,
кандидат культурологии, заведующий кафедрой
истории Беларуси и музееведения

**АКТУАЛІЗАЦЫЯ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ МЯСТЭЧКА ІЗАБЕЛІН ВАЎКАВЫСКАГА РАЁНА**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вёска Ізабелін, што на Ваўкавышчыне, як і кожнае колішняе мястэчка, мае багаты радавод. Даследуючы культурную спадчыну Ізабеліна, можна з упэўненасцю казаць, што гэта адзін з сапраўдных прыкладаў шматэтнічнасці і поліканфесійнасці Беларусі, які дайшоў да нас у шматлікіх праявах – трох храмах у цэнтры паселішча, могілках, традыцыйнай культуры. У дадзеным артыкуле мы разгледзім магчымасці папулярызацыі культурнай спадчыны мястэчка Ізабелін Ваўкавыскага раёна на прыкладзе дзейнасці розных ініцыятываў па вывучэнні, захаванні і актуалізацыі мястэчковай спадчыны.

Гістарычныя віражы Ізабеліна адлюстраваліся ў шматлікіх назвах мястэчка: Петуховічы, Петухова, Крыштафова, Ізабелін, у мясцовай гаворцы – “Забалін” ці “Забалін”. Петухова першапачаткова ўзгадваецца на пачатку XV ст. у Літоўскай Метрыцы. Там адзначаецца, што мястэчка належыла шляхцічу Петуху, а пазней – Войцеху Янавічу Клочку, які быў ахмістрам пры двары вялікай княгіні Алены Іванаўны, жонкі вялікага князя літоўскага Аляксандра Ягелончыка. Ён набывае мястэчка 22 верасня 1499 г. у баяраў Шышка і Некраша Яновічаў на імя Петуховіча. У той час Петуховічы становіцца цэнтрам буйных зямельных уладанняў [4].

У XVI ст. у мястэчку ўладараць Дольскія, у XVII ст. – Дарагастайскія, Сапегі, Курчы. З XVIII ст. мястэчкам кіруе ваўкавыскі падкаморы Міхал

Хлусовіч, дзякуючы якому пачынаюць ладзіць кірмашы на дзень Св. Міхала Арханёла.

Бадай, самым вядомым уладальнікам Ізабеліна быў Ян Флемінг, які і надаў мястэчку новую назву "Ізабелін" у гонар сваёй дачкі Ізабелы. Для развіцця сельскай гаспадаркі і прамысловасці Флемінг запрашае немцаў, сведчаннем існавання якіх з'яўляюцца шматлікія адпаведныя прозвішчы жыхароў, пратэстанцкія могілкі, пабудовы ў стылі "фахверк". Далей мястэчкам кіравалі Грабоўскія. У 1778 г. яны фундуюць кальвінскі збор – цяперашні касцёл Св. Апосталаў Пятра і Паўла. Да 1858 г. Ізабелін становіцца месцам правядзення правінцыйных кальвінскіх сінодаў. З Грабоўскімі звязана і будаўніцтва ўніяцкай царквы, якая ў 1863 г. была перададзена праваслаўным вернікам і займела назву Св. Міхала Арханёла.

Сапраўдным росквітам мястэчка можна лічыць XIX ст. Ізабелін становіцца цэнтрам прамысловай вытворчасці, па паказчыках якой нават пераўзыходзіць некаторыя гарады. Адна з першых мануфактур была суконная, дзе працавалі нямецкія майстры. На той час у мястэчку ўжо дзейнічае шэраг габрэйскіх крамаў і сінагога (з XVIII ст). Пасля 1812 г. Ізабелін становіцца цэнтрам павета. Апошнімі уладальнікамі мястэчка сталі Стравінскія, чый лёс не абмінула паўстанне 1863 г.

Новая старонка Ізабеліна пачынаецца ў часы Першай сусветнай вайны з прыходам войскаў Германскай імперыі. Далей гісторыя мястэчка мела лагічны працяг: у 1918 г. згодна з Трэцяй Устаўной граматай Ізабелін абвяшчаецца часткай БНР, у 1919 г. у адпаведнасці з пастановай I з'езду Камуністычнай партыі Беларусі ўваходзіць у склад БССР, у 1921 г. па Рыжскай мірнай дамове ўваходзіць ў склад міжваеннай Польскай Рэспублікі і становіцца цэнтрам гміны Ваўкавыскага павету Беластоцкага ваяводства.

Міжваенны час стаў сімвалічным для каталіцкай суполкі Ізабеліна. У 1931 г. да мястэчка прыязджае кс. Антоні Германоўскі, а ўжо ў 1934 г. на сродкі вернікаў пачынаецца будаўніцтва драўлянага касцёла. Нажаль, 23 чэрвеня 1941 г. касцёл згарэў. Тым ні менш, падмуркі драўлянага храма

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

захаваліся да нашых дзён. Нямецкія ўлады далі дазвол каталікам збірацца на набажэнствы ў мураваным кальвінскім зборы, пазней старажытны будынак стаў рымска-каталіцкім касцёлам [3].

Зараз Ізабелін – аграгарадок з насельніцтвам крыху больш за 600 чалавек і багатай спадчынай, якая дагэтуль адлюстроўвае цікавы лёс мясціны, што стаяла на скрыжаванні розных культур і рэлігій. Паселішча захавала гістарычную планіроўку, на яго вуліцах можна і па сённяшні час убачыць будынкі ў стылі “фахверк”, колішнія габрэйскія дамы, а ў цэнтры плошчы – падмуркі зруйнаванага касцёла. Таксама ў Ізабеліне дагэтуль дзейнічае касцёл Св. Апосталаў Пятра і Паўла (раней – кальвінскі збор) і праваслаўная царква Св. Міхала Арханёла (былы ўніяцкі храм), а вось сінагога, на жаль, стаіць у занядбаным стане. Не абмінем увагай і мястэчковыя могілкі. Добра захаваліся комплексы пратэстанцкіх і габрэйскіх пахаванняў, ня кажучы ўжо пра праваслаўныя і каталіцкія могілкі.

Ізабелін з’яўляецца яскравым сведчаннем зацікаўленасці мясцовых жыхароў у захаванні мінулага. Дзякуючы актыўнай суполцы каталікоў і праваслаўных пільнуюцца храмы, штогод адбываецца талака па ўпарадкаванню могілак не толькі хрысціянскіх, але і габрэйскіх. Асобна трэба адзначыць дзейнасць кс. Генадзя Кухарэвіча, які арганізоўвае не толькі прыборку могілак, але і збірае артэфакты мінулага – у адным з пакояў плябаніі ўжо існуе невялікая калекцыя прадметаў этнаграфі, нумізматыкі і г. д.

Некалькі гадоў таму назад за актуалізацыю культурнай спадчыны Ізабеліна ўзялося Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры (далей – Таварыства аховы помнікаў) і Студэнцкая Рада пры падтрымцы прыватнага прадпрыемства “Маёнтак Падароск”, у чыёй уласнасці знаходзіцца Ізабелінская сінагога. Першы валанцёрскі летнік адбыўся ў 2018 г. З таго часу Ізабелін збірае аматараў гісторыі з розных куткоў Беларусі. “Мы робім гэта, каб вярнуць у гэтае асяроддзе тыя краявіды, тыя культурныя ландшафты, якія тут існавалі стагоддзямі. Мясцовыя часта

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўжо забылі пра карані, якія ёсць у іх, у гэтага мястэчка", – кажа Юрый Меляшкевіч, намеснік старшыні Таварыства аховы помнікаў [1].

Валанцёры расчышчаюць могілкі, фіксуюць надмагіллі, спецыялісты ствараюць неабходныя дакументы, вядуцца архіўныя пошукі. Больш таго, у межах летнікаў праводзяцца культурна-асветніцкія мерапрыемствы як для мясцовых жыхароў, так і для валанцёраў. Таварыства аховы помнікаў арганізоўвае сустрэчы з рознымі грамадскімі дзеячамі, напрыклад, Ізабеліна наведваў Уладзімір Арлоў, Алесь Краўцэвіч, Віктар Шалкевіч і інш. [2]. Па-за ўвагай не застаецца і віртуальная прастора. Арганізаваная дзейнасць у сацыяльных сетках спрыяе распаўсюджванню ведаў пра гісторыю і культуру мястэчка.

На дадзены момант Таварыства аховы помнікаў працягвае работу па наданні мястэчковым могілкам статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці. Вядзецца распрацоўка плана па іх ўключэнні у сацыяльна-культурны кантэкст рэгіёна праз арганізацыю супольнасці, якая будзе захоўваць і прапагандаваць мінулае мястэчка. Існуе ідэя аб стварэнні адукацыйнага цэнтра па захаванні культурнай спадчыны Ізабеліна на базе сінагогі. Зараз Таварыства рыхтуе да ўсталявання на месцы гістарычных аб'ектаў інфармацыйныя стэнды. На думку Паўла Падкарытава, уладальніка "Маёнтка Падароск", Ізабелін мае магчымасці стаць цікавай турыстычнай кропкай на мапе Беларусі, якая паспрыяе наведванню і суседняга турыстычнага цэнтра ў Падароску, дзе аднаўляецца шляхецкі палац, ствараецца музей і інш.

Актуалізацыі культурай спадчыны мястэчка таксама паспрыяў Беларускі камітэт ICOMOS, які праводзіў адукацыйныя семінары, прысвечаныя сінагогам Беларусі. Акрамя таго, пры падтрымцы камітэта быў сняты відэафільм "Людзі і сінагогі", часткай якога стала Ізабелінская сінагога. Не абмінула мястэчка і аўтарская тэлевізійная праграма Юрыя Жыгамонта "Падарожжы дылетанта". Асобны сюжэт тэлепраграмы "Святыні Беларусі" прысвечаны гісторыі царквы Св. Міхала Арханёла. Пэўныя намаганні ў справе актуалізацыі мінулага Ізабеліна прыкладае і Ваўкавыская раённая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліятэка, ствараючы тэматычныя відэавыпускі па гістарычных месцах раёна, імі таксама распрацаваная экскурсійная праграма.

Летам 2021 г. мястэчка Ізабелін стане часткай праекта “Shtetlfest”, накіраванага на абмен вопытам актуалізацыі культурнай спадчынай былых штэтлаў. Ізабелін войдзе ў міжнародны маршрут, у межах якога адбудзецца экспедыцыя, стварэнне электроннага даведніка, арганізацыя фестываля. Дзейнасць праекта рэалізуецца пры падтрымцы Еўразвяза камандай аматараў габрэйскай культуры – Цэнтрам дзяцей і моладзі (Барысаў, Беларусь) і Fundacja “Teatr Latarnia” (Беласток, Польшча).

Усё вышэй сказанае сведчыць аб тым, што пачатак па папулярызацыі культурнай спадчыны Ізабеліна пакладзены. Тым не менш, такія тэмы, як традыцыйная культура, габрэйская суполка мястэчка, дзейнасць пратэстантаў і г. д., яшчэ чакаюць свайго даследчыка. У вялікай ступені дыяпазон магчымых шляхоў па актуалізацыі культурнай спадчыны старажытнага мястэчка залежыць ад цікавасці грамадства да далейшага вывучэння гісторыі Ізабеліна.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Вярнуць мястэчку карані [Электронны рэсурс] // Hrodna.life. – Рэжым доступа https://hrodna.life/articles/izabelin/. – Дата доступа: 25.02.2021.

2. Вяртанне іўдзейскай спадчыны ў Ізабеліне [Электронны рэсурс] // Новы Час: апошнія падзеі Беларусі, мова, культура і гісторыя онлайн. – Рэжым доступа: https://novychas.by/hramadstva/vjartanne-iudzejskaj-spadczyny-u-izabeline. – Дата доступа: 06.03.2021.

3. Ізабелін [Электронны рэсурс] // Слова Жыцця. – Рэжым доступа: http://slowo.grodnensis.by/index.php?option=com_content&view=article&id=3280%3A12-399&catid=12%3Aparafii-i-swiatynie&Itemid=430&lang=by. – Дата доступа: 06.03.2021.

4. Как Петухово стало Изабелином [Электронный ресурс] // Волковысская газета «Наш час», новости Волковыска. – Режим доступа:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

https://volkovysknews.by/kultura/5296-kak-petuxovo-stalo-izabelinom. – Дата доступа: 28.02.2021.

Бугоркова Г. И., студент 219б группы
Научный руководитель – Володченко А. Ю.,
старший преподаватель

## ЗИМНИЕ ОБРЯДОВЫЕ ИГРЫ БЕЛОРУССКОГО ПООЗЕРЬЯ: ОСОБЕННОСТИ СОВРЕМЕННОЙ РЕКОНСТРУКЦИИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Коляды принадлежат к наиболее поэтичным праздникам в традиционном обрядовом календаре белорусского народа. Соединив в себе глубокую христианскую символику рождения Христа с не менее древним мировоззрением и опытом наших предков, белорусская рождественская традиция сформировала множество интересных художественных форм. Это и стихотворно-песенный пласт, презентующий разные жанры: колядки, щедривки, всевозможные поздравления и пожелания, вплетенные в обрядовость колядных обходов домов, а также и драматические действа, представляющие живые и кукольные вертепы и различные обрядовые игры, разыгрываемые во время данного праздничного периода.

К наиболее популярным зимним обрядовым играм, распространенным в разных регионах Беларуси, относятся «Ваджэнне Казы», «Яшчур», «Цары», «Ката пячы», «Куры», «Шчадрэц», «Цягнуць Каляду на дуба». На Белорусском Поозерье наиболее распространен обряд «Жаніцьба Цярэшкі», который в 2009 году был признан историко-культурной ценностью Беларуси. К сожалению, время внесло свои коррективы: не все перечисленные выше колядные игры сохранились в полной мере. Однако интерес к ним сегодня снова растет, и делаются различного рода попытки их реконструкции.

Цель данной статьи заключается в том, чтобы проанализировать обряд «Жаніцьба Цярэшкі», поскольку он широко распространен и наиболее полно